дкаў і розныя духі «пасяляліся» ўмоўна пад П. Там мясціўся і вуж-*дамавік*. У дачыненні да П. захавалася рэгламентацыя яе падмятання: у дзень ад'езду кагосьці з родных П. не падмятаюць; у пахавальна-памінальнай абраднасці звычай месці ад парога да стала разумеўся як форма запрашэння памерлых, а вымятання да парога — іх выправаджэння (адсюль прыказка «Ад парога падлогу не мятуць»). Дошкі П. сімвалічна звязваліся з ідэяй шляху, толькі ўздоўж іх клалі нябожчыка, бачанне ж падмятання ў сне прадказвала хуткую дарогу. Падмятаць апоўначы катэгарычна забаранялася, бо верылі, што гэта час, што належыць засветам. Але і кідаць П. непадмеценую на ноч таксама непажадана, бо «прыйдзе дамавік і будзе месці». Забаранялася і мыць П. пад чалавекам, які спіць, інакш на яго твары з'явяцца кругі. Каб замовіць шчасце і дабрабыт у хаце, на наваселле госці кідалі на П. манеты; на Тройцу засыпалі П. зялёным аерам.

*Літ.*: Веселле: Абрад. Мн., 1978. С. 256; Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 3. Зямная дарога ў вырай. Мн., 1999. С. 181; Никифоровский Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обычаи и обряды... Витебск, 1897. С. 22; Сицинский А.А. Акушерская помощь в Минской губернии. СПб., 1893. С. 59; Сысоў У.М. Беларускі пахавальны абрад. Мн., 1995. С. 14; Шпилевский П.М. Белоруссия в характеристических описаниях и фантастических поверьях // Пантеон. 1856. Т. 25, кн. 1.

*Т. В. Валодзіна.*

«**ПАДМА́НУТЫЯ ЧЭ́РЦІ**», сюжэт *чарадзейных казак* СУС 518. Звычайна ўваходзіць у кантамінаваныя творы як іх арганічная частка, што і вызначае далейшае развіццё сюжэта. Чэрці не могуць падзяліць паміж сабой чарадзейныя прадметы: шапку-невідзімку, кілімсамалёт, торбу-саматруску. Кемлівы мужык прапаноўвае чарцям свае паслугі і завалодвае гэтымі прадметамі, якія дапамагаюць яму вырашаць розныя цяжкія задачы. Разам з сюжэтам СУС 518 у кантамінаваныя казкі ў розных спалучэннях уваходзяць сюжэты СУС 552 А «Жывёлы-зяці», СУС 302 «Смерць Кашчэя», СУС 566 «Рогі», СУС 567 «Дзівосная птушка» і інш. Гэтыя творы прадстаўлены ў публікацыях Е.Раманава, У.Дабравольскага, Я.Карловіча, М.Федароўскага, Э.Кліха і інш. збіральнікаў.

*Літ.*: Чарадзейныя казкі. Ч. 1. Мн., 1973; Бараг Л.Г. Сюжэты і матывы беларускіх народных казак. Мн., 1978.

*К. П. Кабашнікаў.*

**ПАДПЕ́ЧНІК**, Падпечка, дух, які жыве ў хаце пад печкай. Уяўлялі яго ў выглядзе пачварнай жывёліны, калматага, з чырвонай галавою і вогненнымі бліскучымі вачыма; замест пярэдніх лап у яго чалавечыя рукі, а замест задніх — чалавечыя ногі, толькі з доўгімі кіпцюрамі. Верылі, што П. удзень ніколі не выходзіць з-пад печкі. Часам, калі нікога не бывае дома, акрамя дзяцей, ён высоўвае сваю галаву і, паварочваючы ёю і бліскаючы вачыма, палохае дзяцей, якія раздурэлі ў адсутнасць бацькоў. Аднак ён нічога кепскага ім не робіць. Затое ўночы П. не дае спакою кепскім, грэшным, несумленным людзям і наогул тым, хто зрабіў нейкае злачынства. П. мроіцца ім, з'яўляючыся перад імі ў жахлівых абліччах, выраблаючы розныя страшныя жэсты, бегаючы па сцяне, лётаючы над іх галовамі і казычучы сваёю калматай галавою іх твары. Пра П. ведаюць амаль ва ўсёй Беларусі, толькі пад рознымі назвамі. У народзе можна было пачуць: «Падпечнік налякаў — бачна штось спсутаваў», «Каб табе Падпечка прысніўся».

*Літ.*: Древлянский П. [Шпилевский П.]. Белорусские народные поверья // Журн. М-ва нар. просвещения. 1852. Лит. прибавление № 3.

*У. А. Васілевіч.*

**ПАДУ́ШКА**. Займала важнае месца ў інтэр'еры сялянскай хаты. У народзе лічылася, што на працягу ночы П. ўбірае ў сябе адмоўную энергію чалавека (яго думкі, перажыванні, клопаты дня), а днём «зараджаецца» станоўчай энергіяй ад сонца. Таму П., на якіх спаў чалавек, ніколі не хавалі, а наадварот, падстаўлялі пад сонечныя промні. Існавала абавязковае правіла: на П. нельга было сядзець, інакш можна «адседзець» свой розум. У час сямейных абрадаў у адносінах да П. прытрымліваліся самых розных рэгламентацый. З-пад галавы паміраючага чалавека выцягвалі П. з пер'я (лічылі, што курынае пер'е «не дае памерці») і падкладвалі саламяную, найчасцей з гарохавай саломы. Укладалі ў П. лісце ці пруткі з веніка, а таксама валасы і пазногці, якія збіраліся на працягу ўсяго жыцця паміраючага чалавека. Спецыяльную П. клалі і ў труну. Час-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цей за ўсё яе напаўнялі драўлянай стружкай. Каб убачыць у сне свайго суджанага, дзяўчаты клалі пад П. розныя рэчы, напрыклад, грэбень і казалі: «Суджаны, прыходзь да мяне, валасы часаць, касу расплятаць». Пасля таго, як падзялілі каравай, нявесту садзілі на пуховую П. Потым на яе ж сядалі дзяўчаты, якія доўгі час не маглі выйсці замуж.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 1. Зямля стаіць пасярод свету... Мн., 1999.

*А. В. Катовіч.*

**ПАДХВА́ТНІК**, падхватнікі, удзельнік ці ўдзельнікі абрадавага гурта (валачобнікаў, калядоўшчыкаў). Выконвалі за кожным радком песні, што спяваў *пачынальнік*, прыпеў-рэфрэн «Вясна красна на ўвесь свет!», «Да віно ж маё зеляно!», «Яснае сонца ў ваконца!», «Да зялёны явар кудравы!», «Хрыстос васкрос, сын Божы!» і інш.

*А. С. Ліс.*

**ПА́ДЧАРКА**, падчарыца, няродная дачка мужу або жонцы; даводзіцца роднай аднаму з іх; казачны персанаж (гл. ў артыкулах *Бабіна дачка і дзедава дачка*, *Мачаха і падчарка*).

**«ПАЕ́ХАЎ Я́СЬКА НА РУСЬ ЖАНІ́ЦЦА»**, другая назва балады *«Маці атручвае нявестку і сына»*.

**ПАЗААБРА́ДАВАЯ ПАЭ́ЗІЯ**, народная вуснамоўная песенная паэзія, якая не звязана з традыцыйнымі нар. абрадамі і звычаямі, від фальклору. У адрозненне ад *каляндарна-абрадавай паэзіі* адлюстроўвае самыя розныя бакі жыцця, асабістыя пачуцці і перажыванні чалавека (гл. таксама *Лірыка*, *Лірычныя песні*). Аб'ядноўвае любоўную, сямейную і сацыяльна-бытавую лірыку, балады. Яна адпавядае больш высокаму ўзроўню развіцця свядомасці, светапогляду і светаразуменню народа. Першыя запісы П.п. адносяцца да 17 ст. У нар.-лірычнай песні адлюстраваліся філасофскія, гуманістычныя і маральна-этычныя ўяўленні народа пра ідэал узаемаадносін паміж людзьмі. П.п. вылучаецца эмацыянальнай глыбінёй, багаццем і разнастайнасцю матываў, дае шырокую карціну жыцця народа, яго сямейна-бытавых і сацыяльных адносін.

Любоўная лірыка вызначаецца падборам пэўнага тэматычнага матэрыялу і ідэйнай накіраванасцю лірычнай песні. У ёй праз мастацкія сродкі раскрываецца складаны ўнутраны свет чалавека, яго перажыванні. Ідэя *любоўных песень* пра каханне — абараніць каханне ад перашкод і варожых яму з'яў. Гал. аб'екты самавыражэння *лірычнага героя* — каханая ці каханы, прырода, што з'яўляецца давераннай асобай у каханні, радзіма, уласнае жыццё і інш., якія ўвасабляюцца і разглядаюцца як самастойна існуючыя з'явы. Моцная эмацыянальная афарбоўка любоўнай песні ствараецца глыбокім роздумам героя, смуткам, меланхоліяй, філасофскімі разважаннямі, карцінамі прыроды. Вобразы галоўных герояў (хлопца і дзяўчыны), створаныя паэтычным геніем народа, уражваюць шырынёй мастацкага абагульнення і глыбінёй рэалістычнага выяўлення.

Сямейная лірыка адлюстроўвае сялянскі побыт, гаспадарча-земляробчую працу, мары пра шчасце, а таксама маральна-этычныя праблемы і звычаёвыя прававыя нормы сумеснага жыцця. Лірычная гераіня *сямейна-бытавых песень* — найчасцей маладая замужняя жанчына, якая сумуе па сваёй роднай старонцы, бацьках, а таксама з прычыны крушэння надзей, што звязваліся са шлюбам. У паэтычных творах праслаўляюцца асабістыя і агульначалавечыя якасці: працавітасць, ахайнасць, добры фізічны стан, памяркоўнасць, дабрыня, клапатлівасць пра блізкіх, цярплівасць да чужых недахопаў.

*Сацыяльна-бытавыя песні* паказваюць побыт і гісторыю бел. народа на працягу некалькіх стагоддзяў. Да традыцыйнай сацыяльна-бытавой лірыкі належаць *казацкія песні*, *рэкруцкія і салдацкія песні*, *чумацкія песні*, *бурлацкія песні*, *батрацкія песні*. Ім характэрны востра-сацыяльны змест і грамадская накіраванасць. Узнікненню і шырокаму бытаванню на Беларусі казацкіх песень паклала пачатак паўстанне пад кіраўніцтвам Б.Хмяльніцкага ў 17 ст. Бел. рэкруцкія песні ўзніклі ў канцы 18 — пачатку 19 ст. Яны адлюстроўвалі провады рэкрута на пажыццёвую ваенную службу, развітанне з бацькамі, каханай, блізкімі і гучаць як хаўтурныя галашэнні. Дарожныя пакуты гандлёва-возніцкага промыслу нарадзілі чумацкія песні з матывамі небяспекі, голаду, хваробы, адрыву ад сям'і. У бурлацкіх песнях тэ-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ